# ПУБЛІЧНЫЯ ЦЭНТРЫ ПРАВАВОЙ ІНФАРМАЦЫІ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

*Трус І.М.*

У верасні 2002 г. на разгляд калегіі Міністэрства культуры было вынесена пытанне «Аб стварэнні публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь». Аднаўленне грамадства, развіццё дэмакратычнай прававой дзяржавы – гэтыя і многія іншыя праблемы вылучаюць на першы план рашэнне адной з важных агульнанацыянальных задач – фарміраванне ў Рэспубліцы Беларусь адзінай інфармацыйна-прававой прасторы, якая забяспечвае дастУпнасць прававой інфармацыі для ўсіх структур грамадства і кожнага грамадзяніна паасобку. На рашэнне гэтай задачы накіравана стварэнне публічных цэнтраў прававой інфармацыі (ПЦПІ) на базе сеткі бібліятэк Міністэрства культуры. Арганізацыя ПЦПІ здзяйснялася згодна Указу Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 снежня 1998 г. № 565 «Аб парадку распаўсюджвання прававой інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь» і на аснове супрацоўніцтва Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі (НЦПІ) з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. 28 кастрычніка 1999 г. рашэннем калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь № 8 «Аб дзейнасці абласных навуковых бібліятэк як навукова-метадычных цэнтраў» было прадугледжана стварэнне сеткі публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў рэспубліцы. Першым звяном інфраструктуры сталі абласныя бібліятэкі, якія ў сваю чаргу ўзначалілі работу па фарміраванню сеткі публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў сваіх рэгіёнах. Адпраўным дакументам па актывізацыі дзейнасці ў дадзеным кірунку з'явілася Пагадненне № 8029/2001, падпісанае 18 красавіка 2001 г. паміж НЦПІ і Міністэрствам культуры «Аб стварэнні публічных цэнтраў прававой інфармацыі ў Рэспубліцы Беларусь і развіцці супрацоўніцтва ў вобласці распаўсюджвання прававой інфармацыі»*, у якім вызначаны механізм адкрыцця і функцыяніравання сеткі ПЦПІ. Далей былі распрацаваны, узгодненыя з Міністэрствам культуры і Рэспубліканскай калегіяй адвакатаў і зацверджаныя Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі «Тыпавая праграма стварэння публічных цэнтраў прававой інфармацыі»* і «Тыпавое палажэнне аб публічным цэнтры прававой інфармацыі»*, дзе вызначаны мэты, прынцыпы, задачы і этапы развіцця ПЦПІ. Гэтыя дакументы ў якасці рэгламентуючых былі пакладзены ў аснову работы ў рэгіёнах. У шэрагу абласцей (Гродзенскай, Віцебскай, Брэсцкай) распрацаваны адпаведныя праграмы і палажэнні. Так, у Гродзенскай вобласці праграма аб стварэнні і развіцці ПЦПІ і палажэнне зацверджаны 30 лістапада 2001 г. рашэннем № 626 Гродзенскага аблвыканкома «Аб дзяржаўнай сістэме прававога інфармавання грамадзян Гродзенскай вобласці». У Віцебскай вобласці 22 лістапада 2001 г. рашэннем аблвыканкома № 698 «Аб праграме стварэння і развіцці публічных цэтраў прававой інфармацыі ў бібліятэках Віцебскай вобласці на 2001–2005 гг.» зацверджана праграма стварэння і развіцця ПЦПІ ў бібліятэках. У Магілёўскай вобласці рашэннем аблвыканкома

ад 24.02.2000 г. № 4-24 «Аб паляпшэнні прававога інфармавання грамадзян» прадугледжана фарміраванне сеткі ПЦПІ на 2000–2004 гг. У Мінскай вобласці комплекс мерапрыемстваў знайшоў адлюстраванне ў рашэнні Мінскага аблвыканкома ад 20 верасня 2001 г. № 705 «Асноўныя мерапрыемствы па аўтаматызацыі і камплектаванню фондаў публічных бібліятэк Мінскай вобласці да 2005 г.». Такім чынам, створана прававое асяроддзе для ажыццяўлення і арганізацыі доступу насельніцтва рэспублікі да прававых інфармацыйных рэсурсаў.

Далей стварэнне сеткі ПЦПІ на базе публічных бібліятэк перайшло ў стадыю практычнай рэалізацыі. Пры прыняцці рашэння аб адкрыцці ПЦПІ перавага аддавалася менавіта тым бібліятэкам, якія мелі неабходны стан тэхнічнага аснашчэння. Такі падыход быў выкарыстаны ў Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях. Эталонныя базы набываліся ў першую чаргу ў ЦБС, дзе ЭВМ адпавядалі неабходным патрабаванням і існавала магчымасць іх выкарыстання для прававой інфармацыі. У пераважнасці базы даных набываліся цэнтралізавана, шляхам мэтавага выдзялення бюджэтных сродкаў. Напрыклад, Мінскі аблвыканком вылучыў сродкі для пяці гарадскіх (Барысаўскай, Жодзінскай, Маладзечанскай, Слуцкай і Салігорскай) і адной раённай (Капыльскай) цэнтральных бібліятэк, Магілёўская абласная бібліятэка цэнтралізавана закупіла ЭБДПІ для трох цэнтральных раённых бібліятэк. Заслугоўвае адабрэння вопыт Брэсцкай вобласці. Сведчаннем глыбокай увагі і разумення праблемы з боку аблвыканкома з'яўляецца мэтавае набыццё ЭВМ для ўсіх цэнтральных бібліятэк і неабходных для функцыянавання ПЦПІ пакетаў дакументаў. Амаль у такіх жа маштабах і з такім жа падыходам вялася работа Гродзенскім аблвыканкомам: для абласной бібліятэкі і семнаццаці цэнтральных бібліятэк закуплена камп'ютэрная тэхніка і ЭБДПІ. Трэба адзначыць, што ў аснашчэнні ПЦПІ прыняў удзел і Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі, які на пачатковым этапе стварэння інфраструктуры прававога інфармавання насельніцтва перадаў бясплатна 7 электронных копій ЭБДПІ для ўсіх абласных бібліятэк і цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Я.Купалы г.Мінска.

На канец 2002 г. у Рэспубліцы Беларусь функцыянавала 64 ПЦПІ, якія прадстаўляюць сабой пункты свабоднага доступу грамадзян да афіцыйнай прававой інфармацыі і дзейнічаюць ва ўсіх абласных бібліятэках, у 68% цэнтральных гарадскіх і 30,5% раённых бібліятэк. Калі параўноўваць паказчыкі па абласцях, то з упэўненасцю можна канстатаваць лідэрства Брэсцкай вобласці. Тут, ва ўсіх ЦБС, за выключэннем раённых Баранавіцкай і Брэсцкай, адкрылі прававыя цэнтры. Актыўна разгарнулася дзейнасць у бібліятэках Гродзенскай вобласці. У 85% цэнтральных гарадскіх і раённых бібліятэк функцыянуюць ПЦПІ. Па Віцебскай вобласці гэты паказчык складае 36%, па Мінскай – 25% і па Магілёўскай вобласці – 17,4%. Складаная сітуацыя на сённяшні момант назіраецца ў Гомельскай вобласці. З аднаго боку, публічны цэнтр прававой інфармацыі пры Гомельскай абласной бібліятэцы быў адкрыты для карыстальнікаў першым у рэспубліцы, а з другога – больш ніводнага цэнтра па вобласці не было створана. Кожны цэнтр прававой інфармацыі аснашчаецца

эталонным банкам даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (ЭБДПІ) і іншымі афіцыйнымі выданнямі НЦПІ. Для каардынацыі дзейнасці паміж усімі цэнтрамі вобласці, узаемадзеяння з іншымі структурамі і ўстановамі, для эфектыўнага вырашэння пастаўленых задач, абмеркавання праблем і вынікаў работы, магчымасцей пільнага аналізу і абмена вопытам пры бібліятэках абласнога падпарадкавання сталі ствараццa каардынацыйныя саветы. У склад саветаў увайшлі прадстаўнікі аблвыканкомаў, абласной, гарадскіх і раённых бібліятэк, абласной калегіі адвакатаў. Такім чынам, для грамадзян ствараецца рэальная магчымасць свабоднага і бясплатнага азнаямлення з любым нарматыўна-прававым актам Рэспублікі Беларусь, што садзейнічае фарміраванню прававых ведаў, навыкаў, правамерных паводзін і паважаных адносін да права.

Пры арганізацыі цэнтраў выкарыстоўвалася існуючая структура бібліятэк. Як самастойнае падраздзяленне публічны цэнтр прававой інфармацыі адкрыўся толькі пры Віцебскай абласной бібліятэцы. Ва ўсіх іншых абласных бібліятэках ПЦПІ працуюць у рамках інфармацыйна-бібліяграфічных аддзелаў, у большасці публічных бібліятэк – на базе аддзелаў абслугоўвання і інфармацыі. У сваёй асноўнай частцы кадравы састаў супрацоўнікаў ПЦПІ складаецца з бібліятэкараў і бібліёграфаў. З іх 85% маюць вышэйшую і 15% сярэднюю спецыяльную адукацыю. Спецыялісты цэнтраў валодаюць не толькі асноўнымі навыкамі работы з новымі інфармацыйнымі тэхналогіямі, але і пэўнымі ведамі юрыдычнага характару, разбіраюцца ў пытаннях прававой тэматыкі.

Як паказвае практыка, да інфармацыі на папяровых і электронных носьбітах па шырокаму колу прававых пытанняў звяртаюцца самыя розныя катэгорыі наведвальнікаў: асноўнымі з іх з'яўляюцца студэнты (50,6%), юрысты (18,2%), прадпрымальнікі (8,7%), пенсіянеры (8%) і іншыя (14,5%). Да шэрага іншых адносяцца педагогі, работнікі прававых органаў улады, работнікі аддзелаў кадраў, эканамісты, бухгалтары. Існуючыя ў цэнтрах інфармацыйныя рэсурсы дазваляюць выконваць разнастайныя запыты карыстальнікаў. Запыты студэнтаў накіраваны на задавальненне інфармацыйных патрэб, узнікшых у працэсе вучобы; юрыстаў цікавяць пытанні арбітражнай, падаткавай, судовай практыкі; прадпрымальнікі свой погляд накіроўваюць да падаткавага заканадаўства, дагаварнога права, бухгалтарскіх дакументў; пенсіянераў у большасці цікавіць заканадаўства ў сацыяльнай сферы. Для задавальнення разнастайных пытанняў юрыдычнай накіраванасці ў цэнтрах выкарыстоўваюцца прававыя рэсурсы на розных носьбітах інфармацыі, як на электронных, так і традыцыйных. Асноўная частка запытаў выконваецца з дапамогай эталоннага банка даных прававой інфармацыі, які атрымаў прызнанне сярод бібліятэк і іх карыстальнікаў. Напрыклад, у Гомельскай абласной бібліятэцы з выкарыстаннем ЭБДПІ выканана 93,2% запытаў па праву. Сярод гарадскіх бібліятэчных сістэм ЭБДПІ больш за ўсё выкарыстоўваюць бібліятэкі Віцебскай вобласці – 70,8%. У цэлым па рэспубліцы агульная колькасць запытаў па прававой інфармацыі, выкананых з дапамогай ЭБДПІ, складае 60,6%. Гэтыя даныя відавочна паказваюць стан

запатрабаванасці прававых дакументаў і інфармацыйную ёмкасць ЭБДПІ. Трэба адзначыць, што колькасць чытачоў, якія аддаюць перавагу электроннаму рэсурсу, пастаянна расце. Наяўнасць падобных інфармацыйна-прававых сістэм змяняе воблік бібліятэкі і дае магчымасць наладжваць шматлікія ўзаемавыгадныя сувязі, як з дзяржаўнымі, так і з іншымі ўстановамі.

У прававых цэнтрах здзяйсняецца комплекс паслуг, які адпавядае патрабаванням інфармацыйна-бібліятэчнага сэрвісу. Наведвальнікі маюць магчымасць ажыццяўляць бясплатна пошук і прагляд дакументаў па эталоннаму банку даных прававой інфармацыі. Платна ў большасці цэнтраў выконваецца капіраванне нарматыўна-прававых актаў на дыскеты і атрыманне копій на папяровым носьбіце, састаўленне спісаў нарматыўных дакументаў па тэме запытаў наведвальнікаў. Акрамя таго, у цэнтрах можна атрымаць аператыўную інфармацыю аб новых паступленнях літаратуры па праву.

Абагульняючы вышэйсказанае, з упэўненасцю можна адзначыць, што ў цяперашні час працэс стварэння і станаўлення дзяржаўнай сеткі публічных цэнтраў прававой інфармацыі знаходзіцца ў стадыі развіцця, і ад таго, як ён будзе здзяйсняцца далёй, залежыць і ход прававой рэформы, і рост прававой свядомасці насельніцтва, і вырашэнне шматлікіх сацыяльна-эканамічных праблем, як у цэлым, так і для кожнага грамадзяніна асобна. Далейшая эфектыўнасць работы публічных цэнтраў прававой інфармацыі будзе залежыць ад многіх фактараў. Галоўным з іх з'яўляецца актуалізацыя ЭБДПІ, якую сёння можна назваць эпізадычнай. Часцей за ўсё эталонны банк даных абнаўляецца раз у квартал, радзей – раз у месяц і зусім рэдка – штотыднёва. Выйсце са складанай сітуацыі бібліятэкі вымушаны сёння шукаць самастойна. Неабходна падкрэсліць, што бібліятэкі заўсёды набывалі літаратуру прававой тэматыкі і фарміравалі ў сваіх фондах калекцыі заканадаўчых дакументаў. Але друкаваная крыніца інфармацыі часцей за ўсё спазняецца, і толькі выкарыстанне прававой інфармацыі ў электронным выглядзе значна палепшыць пошук неабходных прававых крыніц, а аператыўнасць абнаўлення дазволіць бібліятэцы своечасова здзяйсняць актуальныя запыты карыстальнікаў. Для вырашэння праблемы папаўнення ЭБДПІ неабходна сумесна з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі разгледзець магчымасць бясплатнай пастаўкі і актуалізацыі эталоннага банка даных прававой інфармацыі ў ПЦПІ.

На жаль, сёння бібліятэкі яшчэ не могуць выкарыстоўваць глабальную сетку Інтэрнет для актуалізацыі ЭБДПІ і выканання складаных інфармацыйна-бібліяграфічных запытаў прававой тэматыкі, што дало б магчымасць прадстаўляць штодзённа інфармацыю аб усіх прынятых у рэспубліцы прававых актах.

Бібліятэкі маюць шматгадовы вопыт работы па максімальнаму накапленню і выкарыстанню прававой інфармацыі на папяровых носьбітах, па распаўсюджванню і папулярызацыі прававых ведаў. Каб правільна спалучыць інфармацыйныя рэсурсы на розных носьбітах, неабходна мэтанакіравана камплектаваць фонды, прадумана вызначыць рэпертуар перыядычных выданняў, неабходных цэнтрам для прававога інфармавання.

Для стварэння шматаспектнай базы прававой інфармацыі патрэбна вырашыць праблему збору і захавання нарматыўна-рэгламентуючых дакументаў мясцовых органаў улады. Гэта інфармацыя адлюстроўвае той пласт жыцця грамадства, дзе вырашаецца 90% усіх праблем, з якімі сутыкаецца насельніцтва кожнага рэгіёна. Да гэтага часу яшчэ не адпрацаваны механізм паступлення такой інфармацыі ў бібліятэкі.

Застаецца актуальнай праблема адсутнасці неабходнай тэхнікі для ажыццяўлення паўнацэннай дзейнасці публічных цэнтраў прававой інфармацыі. У далейшым патрэбна здзейсніць праграму тэхнічнай і інфармацыйнай падтрымкі сеткі ПЦПІ і аснасціць камп’ютэрнай тэхнікай і праграмным комплексам тыя бібліятэкі, на базе якіх яшчэ будуць фарміравацца ПЦПІ. Адчуваецца таксама вострая неабходнасць у больш грунтоўнай і практычнай падрыхтоўцы спецыялістаў ПЦПІ як абласных, так і публічных бібліятэк.

На жаль, на месцах не выконваецца пункт 3.9. «Палажэння аб ПЦПІ» па аказанню юрыдычнай дапамогі насельніцтву спецыялістамі Рэспубліканскай калегіі адвакатаў. Пакуль што ў рабоце ПЦПІ не задзейнічаны практыкуючыя юрысты, студэнты юрыдычных факультэтаў вышэйшых вучэбных устаноў.

У перспектыве ПЦПІ павінны болей увагі ўдзяляць рэкламе сваёй дзейнасці, асвятляць цікавыя напрацоўкі і мерапрыемствы ў сродках масавай інфармацыі, абагульняць вопыт сваёй работы.

На калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, у якой прымалі ўдзел прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, адзначалася, што ў рабоце па прававой інфарматызацыі насельніцтва ёсць пэўныя дасягненні: створана інфраструктура ПЦПІ, вырашаюцца пытанні іх аснашчанасці, здзяйсняецца абслугоўванне насельніцтва, якое атрымала магчымасць свабоднага і бясплатнага доступу да прававой інфармацыі. Аднак, як і любая сістэма, якая развіваецца, існуе шэраг праблем і нявырашаных пытанняў. З мэтай удасканалення дзейнасці і развіцця сеткі ПЦПІ калегіяй Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь вырашана:

-хадайнічаць перад Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі аб бясплатнай ці зніжанай аплаце першапачатковай пастаўкі камплекта эталоннага банка даных прававой інфармацыі і яго далейшай актуалізацыі;

-у I паўгоддзі 2003 г. сумесна з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі адкрыць ПЦПІ ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі і надаць яму статус адзінага рэспубліканскага навукова-метадычнага і навучальнага цэнтра па забеспячэнні дзейнасці публічных бібліятэк як публічных цэнтраў прававой інфармацыі;

-упраўленням культуры аблвыканкомаў і Мінгарвыканкома садзейнічаць мэтанакіраванаму папаўненню масіву нарматыўна-прававой інфармацыі мясцовых органаў улады;

-сумесна з мясцовымі юрыдычнымі і праваахоўнымі органамі арганізаваць у ПЦПІ бясплатнае юрыдычнае кансультаванне згодна з “Тыпавой праграмай стварэння публічных цэнтраў прававой інфармацыі”;

-забяспечыць на працягу 2003 г. мэтанакіраванае выдзяленне камп'ютэрнай тэхнікі бібліятэкам, на базе якіх прадугледжваецца стварэнне ПЦПІ;

-абласным універсальным бібліятэкам неабходна разгарнуць шырокую рэкламную кампанію дзейнасці ПЦПІ;

-абагульняць вопыт бібліятэк з мэтай аб'ектыўнай ацэнкі вынікаў работы ПЦПІ, арганізаваць яго асвятленне ў сродках масавай інфармацыі.